**УДК 39**

# ЛЕГЕНДАРНЫЯ ВАЛУНЫ Ў СТРУКТУРЫ КУЛЬТУРНАГА ЛАНДШАФТУ БЕЛАРУСАЎ

***Д. А. МАЛЧАНАВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*Характэрнай рысай беларускага ландшафту з’яўляюцца валуны. Камні з’яўляюцца непаўторным элементам ландшафту беларусаў. У першаю чаргу адыгрывае важную з’яву ў рэлігійнай сістэме. Таксама з вялізнымі валунамі звязаны паданні і легенды са старажытных часоў, звесткі якія сустракаюцца ў розных дакументах і летапісах.*

***Ключавыя словы**: легендарныя валуны, сакральная геаграфія Беларусі.*

На Беларусі культ камянёў бярэ пачатак ад першабытных часоў. Прычына іх абагаўлення - спецыфічныя якасці каменя, якія ў старажытнага чалавека выклікалі асаблівае і адмысловае стаўленне. Нашых продкаў ураджвала цвёрдасць, непахіснасць ды нязменнасць каменя ў параўнанні з жывой прыродай. Гэтыяякасці, сваім парадкам, далі падставу верыць, быццам камень -неўміручая істота. Крыху фантазіі, а яе ў прашчураў было ці неболей, як у нас, і ў выветраных, вычасаных ледавіком каменныхформах яны бачылі людскія твары, сляды, адбіткі рук, абрысы жывёл.

Валуны, культавыя і легендарныя, - гэта не толькі рыса ландшафту, яны даўно і трывала ўвайшлі ў матэрыяльную і духоўную спадчыну беларусаў. На тэрыторыі нашай краіны ёсць шмат вялізных камянёў: у весцы Горкі Шумілінскага раёна, Вароніна - Сенненскага, Пугачы - Шчучынскага, інш. Даўжыня некаторых камянёў дасягае дзесяці метраў. Каля вёскі Карчова Баранавіцкага раёна ляжыць велічэзны валун, празваны Філарэтаў камень, значную частку якога некалі аддзялілі ад асноўнага масіву на выраб жорнаў. Частку другога агромністага каменя, што каля вёскі Літоўка Навагрудскага раёна, знішчылі на будаўніцтва [1. с, 112-113].

Трэба адзначыць, што ўсе сакральныя камяні - легендарныя, бо ёсць легенда, якая тлумачыць іх сакральнасць, але не ўсе легендарныя камяні – сакральныя, бо ёсць легенды гістарычнага плану.

У архіўных запісах канца XIX – пачатку XX стст. Успамінаюцца камяні са следам Валатоўны. Прыкладам, камень са следам Кацярыны-Валатоўны, або Кацярыны-Асілка, каля горада Слаўнарада, былога Прапойска. Паданне расказвае пра сватанне Сцяпана і Марка, прыгожых і дужых хлопцаў, да мясцовай дзяўчыны Кацярыны. Каб лягчэй было адмовіць нялюбаму Марку, дзяўчына наладзіла паміж хлопцамі спаборніцтва: кіданне вялікіх камянёў. І каханаму Сцяпану дастаўся камень велічынёй за стол, а яго суперніку, зразумела, большы – велічынёй з печ. Кінулі хлопцы свае камяні дый пайшлі глядзець, чый дзе апынуўся. Але вышла так, што Сцяпанаў камень усё роўна ўпаў бліжэй за Маркаў. Тады Кацярына ступіла на Сцяпанаў камень і кажа: “Чым даставацца нялюбаму, пайду лепш людзям вадой служыць!”. Кінулася яна з каменя ды разлілася вадой. А на самім каменя ад тае пары застаўся яе след– след Кацярыны-Валатоўны [1. с, 119].

Некаторыя з культавых камянёў носяць “колерныя” назвы - Белы, Сіні, Буры Камень і інш. Вядома, што колеравая сімволіка ў традыцыйнай культуры беларусаў адыгрывала немалаважную ролю і па-свойму тлумачыла міфапаэтычную мадэль свету. Кожны колер адпавядаў той ці іншай з’яве ў яе кантэксце. Так, на тэрыторыі Беларусі зафіксаваны дадзеныя пра чатыры Белыя Камяні, але, несумненна, іх значна больш. Белы колер у міфалогіі нашых продкаў азначаў перш за ўсё сакральнасць, чысціню, урадлівасць, сімвалізаваў жыццёвы пачатак, нараджэнне і святло. Пацвярджалася гэта і старажытнымі тэкстамі замоў, дзе пасярод мора ўзгадваўся нейкі міфічны камень белага колеру, які лічыўся сакральным і называўся яшчэ Латыр-Камень, або АлатырКамень. Паводле народных павер’яў, “лад тым каменем схавана сіла магутная, ітой сіле канца няма”. Камень сімвалізаваў сабой пачатак свету і ўсяго існага на ім, нават хвароб. Напрыклад, у замове ад шалу гаворыцца: “На моры, на лукамор’і ляжыць белы камень, на тым камені сядзіць дзедзька-белабарэдзька. Прашу цябе, дзедзька-белабарэдзька, што б ты вынімаў шал...”. Белыкамень у замовах быў яшчэ і мяжой паміж тым і гэтым светам, і на ім абавязкова павінен быў сядзець нехта з ахоўнікаў гэтай мяжы. Часта на камені сядзяць розныя міфічныя істоты. Такой істотай можа быць змяя Шкурапея або іншы прадстаўнік змяінай пароды - лічылася, што яны валодаюць таемнымі ведамі і кіруюць усімі ведзьмакамі і чараўнікамі. Менавіта да сакральнага каменя і такіх ахоўнікаў накіраваны некаторыя беларускія замовы ад чарадзейства, спуду або ад змяіных укусаў. Старажытныя беларусы верылі, што падчас Узвіжання - восеньскага народнага свята, калі ўсё прыродзе “дзвігаецца” – усе гады спаўзаюцца пад які-небудзь вялікі камень і там зімуюць да наступнай вясны [3. с, 151-152]. “*Возера Крывоя і Сівы камень. Там лука такая, кала дзярэўні Падліпкі. Ішла жэншчына, нешта сказала на Бога, атвярнулася, сказала і ў камень прэўраціласа. І камень там ляжыць*

*бальшой*” (Ушацкі р-н), “*Нахадзіўся ў тым камені чорт, нячыстая сіла. Паднасілі яму шыць. Як скажуць: “Пашый харашо”, – то ён якую штуку ўклеіць. А як: “Пашый,пажаласта, як сам знаеш”, – адчаканіць харашо. Ці кажух ці што. Сівы камень. Там змей нахадзіўся у камні. Врэд ня дзелаў. Падыдзі, скажы, вот забылася, як звалі, каб пашыў. Адкрываецца акно… і бярэць, і закрываецца. Ад прэдка свету такі. Там дзярэўня Есяноўка. Змяіны камень. Як кінеш камянём у той камень, ён забарабаніць*” (Лепельскі р-н)[4. с, 244].

Трэба адзначыць, што многія камяні звязваюць з гістарычнымі асобамі, напрыклад, Рагвалодаў камень, камень Напалеона, камень Баторыя, Барысавы камяні.

Самыя знакамітыя сярод камянёў з надпісамі і знакамі – гэта Барысавы камяні. На тэрыторыі Беларусі яны шырока вядомы як манументальныя помнікі эпіграфікі XII ст, і ў XXI ст. гэтыя камяні ўзгадваюцца ў хроніках. Даследчыкі лічаць, што да прыняцця хрысціянства Барысавы камяні былі язычніцкімі фетышамі. У народзе амаль да XX ст. камяні насілі назвы Барыс, БарысХлебнік, Барыс-Глеб, Барыса-Глебскі, Пісанік, Пісар і да т. п.

На тэрыторыі нашай краіны знаходзіцца сем такіх помнікаў, вядомых і апісаных у навуковай літаратуры. Пяць з іх размешчаны ў рэчышчы Заходняй Дзвіны, а два - на сушы. На камянях высечаны крыжы і надпісы тыпу «Господи, помози рабу своему Борису...» Шмат хто з даследчыкаў лічыць, што высечаныя на каменях крыжы і надпісы былі зроблены па загадзе полацкага князя Барыса Усяславіча, сына легендарнага Усяслава Чарадзея, у пачатку XII ст. у сувязі з ажыўленнем язычніцкіх вераванняўпадчас голаду 1128 года [3. с, 140].

Цікавае паданне і пра так званы Рагвалодаў Камень з надпісам каля в. Дзятлава на Аршаншчыне. Згодна аднаму варыянту, на гэтым месцы адбывалася бітва паміжРагвалодам і Друцкімі князямі, згодна другому - Рагвалод, вяртаючыся з паходу, адпачываў на гэтым месцы са сваёй дружынай і тут яму сніліся нябожчык бацька Барыс і брат Глеб. Шмат сустракаецца ў рэспубліцы камянёў з высечанымі на іх крыжамі, а таксама каменных крыжоў. Многія з іх знаходзяцца на могілках, але сустракаюцца і на перакрыжаваннях шляхоў, на месцах бітваў, у памяць знамянальных падзей. Каля воз. Сялява тры крыжы - Макараўскі, Маіссеўскі і Скарпіён. Згодна паданням, пад першымі двума пахаваны рускія генералы, пад крыжам Скарпіён - французскі генерал. Крыж у Заслаўі нібыта быў пастаўлены на месцы забойства нейкага Федзькі, якога па дарозе забілі рабаўнікі, каб адабраць грошы, якія ён атрымаў за прададзеную карову. З крыжам у в. Мішневічы Шумілінскага раёна звязана паданне пра трагічнае каханне і інш. [2. с,40].

Два паданні пра камяні звязваюць з князем Вітаўтам. Камень з Вітаўтавымі відэльцамі знаходзіўся ў XIX ст. на беразе р. Ушачы. Каля в. Воронічы Полацкага раёна Віцебскай вобласці ляжаў Камень з талеркамі. Паводле падання, на камені абедаў князь Вітольд (Вітаўт). У Віцебску насупраць Сабornай Успенскай царквы ляжаў некалі Іясафатаў камень, або Камень Кунцэвіча.

У парку г. п. Брагін у Гомельскай вобласці ляжыць Камень Кахання, пра які распавядаюць, быццам каля яго адбылася сустрэча Ілжэдзмітрыя з Марынай Мнішак. Паводле іншай версіі падання, Марына Мнішак тут адпачывала.

У в. Язна Мёрскага раёна Віцебскай вобласці сцвярджаюць, што на вялікім камені нібыта высечаны абрысы талеркі, відэльцаў і лыжкі. Тут “абедала” царыца Кацярына, а паводле іншага варыянта падання, “абедаў” Напалеон. Французскі імператар “абедаў”і на вялікім прыдарожным камені каля в. Малькі Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці. Каля в. Снегі, што на мяжы Браслаўскага і Мёрскага раёнаў, на перашыйку паміж азёрамі Укля і Абстэрна, знаходзіцца вялізнае нагрувашчванне валуноў. Паводле падання, на самым вялікім з іх сядзеў Напалеон [3. с,167].“*Ёсць камень за Казаковым, возле Целяшонкаў. Там камень і камень, але гавораць, што когда-та там, кагда ў 812-м гаду Напалеон шол на Маскву, вродзе бы атдыхаў на гэтым камні. Но гэта такія легенды ціпа ходзяць*” (Мёрскі р-н) [4. с, 245].

Але не толькі французскі імператар пакінуў на нашых валунах свае “сляды”. Зафіксаваны паданні і пра камяні Баграціёна. Іх два, і ляжаць камяні сярод поля каля в. Каменнае Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Памеры аднаго з іх: 53 х 35 х 24 м, адругога-7 х 3,5 х 1.8 м. Калісьці каля камянёў стаяў драўляны крыж з двухскатным дахам. Сюды прыходзілі шматлікія паломнікі і пакідалі на камянях ахвяраванні. Пра гэтыя валуны існуе два паданні. Паводле аднаго з іх, некалі камяні былі адной вялізнай камлыгай, на якой маглі танчыць 12 пар. Паводле іншага падання, у 1812 г. тут быў штаб Баграціёна [3. с, 168].

Такім чынам, легендарныя валуны з’яўляюцца неадметнай часткай беларускага ландшафта. Легендарныя валуны маюць сваю гісторыю. Даволі часта сустракаюцца камякі, якія звязаны з гістарычнымі асобамі – Рагвалодаў камень, камень Напалеона, камень Баторыя, камень Вітаўта. Некаторыя камні насяць назвы – Белы камень, Сіні камень, Буры камень і кожны каляровы камень нясе сваю сімволіку ў традыцыйнай культуры беларусаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Дучыц Л. Сакральная геаграфія Беларусі / Л.Дучыц, І.Клімковіч. — Мінск: Літаратура і Мастацтва. – 2011. —349 с.
2. Дучыц, Л. У. Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданняхбеларусаў / Л. У. Дучыц. – Мінск, 1993. — 52 с.
3. Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі / А. К. Карабанаў [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Інстытут прыродакарыстання. — Мінск : Беларус. Навука, 2011. — 235 с.
4. Полацкі этнаграфічны зборнік/ уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача.— Вып. 2. Ч.1: Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. Ч. 1.—Наваполацк : ПДУ. — 2011. —290 с.